**РЭКОРДНЫЯ ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ, НОВЫЯ НАПРАМКІ, ПАШЫРАНЫЯ ГАРАНТЫІ**
Падводзім вынікі прыёмнай кампаніі БДУ – 2025
Стар. 2

**НЕ ПРОСТА ВУЧОБА**
Як Лізавета Занько ператварае студэнцтва ў яркі вопыт
Стар. 3

**СЕМ'І Ў БДУ**
Гісторыі кахання
Стар. 4

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by
# УНІВЕРСІТЭТ
*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*
15 жніўня 2025 года, №8 (2299)

# НАВУКА БЕЗ МЕЖАЎ: БДУ І ПЕКІНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ АДКРЫЛІ СУМЕСНЫ ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР

**Візіт дэлегацыі Пекінскага ўніверсітэта (ПКУ) адбыўся ў БДУ.**

Афіцыйная праграма ўключыла разнапланавыя мерапрыемствы. Знакавай падзеяй стала адкрыццё ў БДУ Беларуска-кітайскага цэнтра фундаментальных навуковых даследаванняў. Рэктар БДУ **Андрэй Кароль** нагадаў, што ініцыятыву стварэння цэнтра падтрымаў Прэзідэнт Беларусі **Аляксандр Лукашэнка** ў мінулым годзе падчас сустрэчы з экс-сакратаром партыйнага камітэта ПКУ Хаа Пінам. Дадзеную падзею ўключылі ў План супрацоўніцтва паміж урадамі Беларусі і Кітая ў рамках ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Важным крокам да рэалізацыі праекта стала стварэнне ў лістападзе 2024 года першага Беларуска-кітайскага цэнтра фундаментальных навуковых даследаванняў у Кітаі на базе ПКУ. Цяпер аналагічнае падраздзяленне адкрыта таксама ў Беларусі на базе БДУ.



По словах рэктара Андрэя Караля, дадзенае рашэнне з'яўляецца лагічным працягам плённага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. «Сёння мы знаходзімся на стадыі глабальнага пераходу ад колькасці да якасці. На працягу многіх гадоў развіваюцца кантакты паміж Беларуссю і Кітаем, у прыватнасці, у сферы вышэйшай адукацыі, навукі, культуры. І шмат у чым гэтыя сувязі акумуляваны ў БДУ і яго партнёрах, – падкрэсліў рэктар. – Калі першапачаткова ў профілі нашага ўзаемадзеяння была толькі біялогія, то ў наш час мыназіраем уцягнутасць шасці факультэтаў БДУ ў сумесныя беларуска-кітайскія праекты. Нашы студэнты рэгулярна бяруць удзел у летніх школах, акадэмічных абменах. Да прыкладу, сёлета прадстаўніца гістарычнага факультэта была намінавана і прайшла адбор для навучання ў ПКУ. Гэта таксама адзін з вынікаў планамернага збліжэння».

Дадзеную думку падтрымаў Гун Цыхуан. З яго слоў, адкрыццё цэнтра з'яўляецца новым стартам у развіцці беларуска-кітайскага сяброўства і стане добрым стымулам для кансалідацыі навуковых супольнасцяў дзвюх краін для рашэння важных пытанняў сучаснасці. Так, у якасці адной з перспектыўных тэм для сумеснай працы рэктар ПКУ назваў штучны інтэлект.

Вынікам дзейнасці цэнтра стануць шматпрофільныя, міждысцыплінарныя фундаментальныя і прыкладныя распрацоўкі і даследаванні ў галінах матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі. Пералік сфер будзе дапаўняцца па ўзгадненні бакоў. Функцыянаванне цэнтра дазволіць павялічыць эфектыўнасць сумеснага навучання спецыялістаў на розных узроўнях адукацыі, садзейнічаць абмену адукацыйнымі і навуковымі рэсурсамі, якасці падрыхтоўкі навуковых кадраў. Паводле дасягнутых дамоўленасцяў, падраздзяленне забяспечыць узаемадзеянне навукоўцаў Беларусі і Кітая па шэрагу напрамкаў. Гэта абмен ведамі і досведам; доступ да лічбавых адукацыйных рэсурсаў; арганізацыя сумесных вытворчых практык, сімпозіумаў, круглых сталоў, канферэнцый і інш.



На дадзены момант ужо вызначаны патэнцыйныя партнёры з абодвух бакоў і сфарміраваны канкрэтныя праектныя прапановы, запатрабаваныя эканомікай Беларусі і КНР. У прыватнасці, звыш 60 ініцыятыў распрацавалі факультэты геаграфіі і геаінфарматыкі, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, біялагічны, хімічны, механіка-матэматычны, навукова-даследчыя інстытуты БДУ. Прапановы накіраваны на рашэнне фармацэўтычных, медыцынскіх, ландшафтных пытанняў і праблем, закранаюць сферы картаграфіі, транспарту, інфармацыйных тэхналогій, космасу, механікі і іншыя перспектыўныя напрамкі.

Праграма візіту дэлегацыі ПКУ таксама ўключала сустрэчы, дыскусіі і абмеркаванні па пытаннях пашырэння супрацоўніцтва паміж Беларуссю і КНР у галіне адукацыі і навукі. Важнай падзеяй пазначана падпісанне пагаднення пра адкрыццё сумеснай магістратуры ў галіне біялагічных навук. Акрамя таго, удзельнікі сустрэчы далучыліся да ўрачыстай цырымоніі ўскладання кветак да манумента Перамогі ў гонар загінулых у Вялікай Айчыннай вайне.

Таксама адным з пунктаў праграмы стала наведванне фізічнага і біялагічнага факультэтаў. Падчас мерапрыемства кітайскім гасцям правялі экскурсію па карпусах падраздзяленняў, прэзентавалі найноўшае матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне, якое выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе, высока-тэхналагічныя кабінеты і лабараторыі, распавялі пра навуковыя магчымасці і кар'ерныя перспектывы выпускнікоў. Удзельнікам дэлегацыі расказалі пра ключавыя вынікі даследчай дзейнасці студэнтаў і навукоўцаў, пра перадавыя навуковыя дасягненні БДУ. У ліку найбольш запатрабаваных распрацовак біялагічнага факультэта – лекавыя сродкі, якія выкарыстоўваюць пры лячэнні захворванняў крывяноснай сістэмы, ветэрынарныя прэпараты, угнаенні для сельскагаспадарчых культур. Кітайскім калегам распавялі пра комплексны прэпарат «Жыцень», які павышае якасць глебы. Гэта першае ў Беларусі мікрабіялагічнае ўгнаенне, якое паскарае тэмпы раскладання ржышча і саломы. Назва распрацоўкі ўзыходзіць да нацыянальнага фальклору: менавіта так у беларусаў называецца дух-заступнік палёў і ўраджаю. Завяршылася сустрэча экскурсіяй у заалагічны музей БДУ і размовай са студэнтамі.

## ДАВЕДКА

Супрацоўніцтва БДУ і Пекінскага ўніверсітэта ажыццяўляецца з 2019 года ў рамках шасці пагадненняў. ВНУ рэалізуюць сумесную праграму навучання студэнтаў, актыўна развіваюць акадэмічную мабільнасць, у тым ліку навучанне па абмене. БДУ і ПКУ з'яўляюцца суарганізатарамі Форуму рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі і КНР, беларуска-кітайскага фестывалю «Зроблена ў Беларусі». У мінулым годзе ВНУ заснавалі Дні сяброўства і адзінства БДУ і ПКУ, у рамках якіх быў арганізаваны Беларуска-кітайскі моладзевы форум.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
15 жніўня 2025 года, №8 (2299)

# РЭКОРДНЫЯ ПРАХАДНЫЯ БАЛЫ, НОВЫЯ НАПРАМКІ, ПАШЫРАНЫЯ ГАРАНТЫІ: ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ БДУ – 2025

**4262**
КОЛЬКАСЦЬ ЗАЛІЧАНЫХ АБІТУРЫЕНТАЎ*:

- 2607 – НА ДЗЁННУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ
- 112 – НА ЗАВОЧНУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ
- 1401 – НА ДЗЁННУЮ ПЛАТНУЮ ФОРМУ
- 142 – НА ЗАВОЧНУЮ ПЛАТНУЮ ФОРМУ

**14,9** ЧАЛАВЕКА
«графічны дызайн і мультымедыя-дызайн»

*
- 138 абітурыентаў на платную форму па хадайніцтве спартыўных федэрацый і саюзаў залічана дадаткова;
- 10 грамадзян краін СНД;
- 88 абітурыентаў на завочную платную форму для атрымання другой вышэйшай адукацыі (скарочаны тэрмін навучання).

**Прыёмная кампанія прайшла ва ўмовах высокай канкурэнцыі. Усяго ўніверсітэт залічыў 4262 абітурыенты. Сёлета можна назіраць рэкордныя прахадныя балы на шэраг спецыяльнасцяў: «сусветная эканоміка» і «міжнароднае права» (398 балаў), «міжнародная эканоміка і гандаль (з паглыбленым вывучэннем кітайскай мовы)» (397), «прыкладная інфарматыка» (391). Акрамя таго, студэнтамі БДУ сталі 16 чалавек, якія набралі 400 балаў па выніках ЦТ і ЦЭ.**

Рэктар БДУ Андрэй Кароль звярнуў увагу на станоўчыя тэндэнцыі гэтага года:

– Было пададзена 4309 заяў, што кажа пра цалкам закрыты бюджэт. Акрамя таго, у гэтым сезоне павялічылася колькасць абітурыентаў – пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. Ад іх паступіла 111 заяў. Таксама цікавая статыстыка залічаных без экзаменаў: сёлета 555 чалавек у параўнанні з 458 у мінулым годзе. Важна адзначыць, што 27,5% ад агульнай колькасці абітурыентаў склалі медалісты. Да таго ж 1687 чалавек скончылі ліцэі і гімназіі.

Самы высокі конкурс падчас прыёмнай кампаніі быў адзначаны на спецыяльнасцях факультэта сацыякультурных камунікацый «графічны дызайн і мультымедыя-дызайн» (14,9 чалавека на месца), «дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя» (5,6 чалавека) і «дызайн касцюма і тэкстылю» (5 чалавек).

Вырас конкурс і на завочнай бюджэтнай форме навучання. Тут ён склаў 3 чалавекі на месца, летась – 2,48.

Традыцыйна ўнутраныя ўступныя іспыты прайшлі на пяці факультэтах (філалагічным, юрыдычным, гістарычным, журналістыкі, ФСК) і ў МДЭІ імя А. Д. Сахарава.

Прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ Віктар Кочын адзначыў асаблівасць прыёмнай кампаніі гэтага года – увядзенне чатырох новых спецыяльнасцяў: «афрыканістыка» (387 балаў), «міжнародная эканоміка і гандаль (з паглыбленым вывучэннем кітайскай мовы)» (397), «інтэлектуальная электроніка» (360), «камп'ютарнае мадэляванне і распрацоўка вэб-дадаткаў» (342). Лічбы паказваюць, што адкрытыя спецыяльнасці карыстаюцца папулярнасцю ў абітурыентаў.

– У ліку тых, хто паступае – пераможцы алімпіяд, выпускнікі ліцэя імя Ф. Э. Дзяржынскага БДУ, уладальнікі стабальных сертыфікатаў па ЦЭ і ЦТ – тыя маладыя людзі, якія ў далейшым будуць вызначаць многія напрамкі нашай краіны і стануць кваліфікаванымі спецыялістамі з высокім узроўнем ведаў, – распавёў Віктар Кочын.

Напрыканцы Андрэй Кароль дапоўніў:

– Важнай асаблівасцю сёлетняга сезона стала пашырэнне сацыяльных гарантый для першакурснікаў педагагічных спецыяльнасцяў БДУ прыродазнаўчага профілю. У прыватнасці, гаворка ідзе пра абітурыентаў, якія ў 2025 годзе паступілі на названыя спецыяльнасці фізічнага, механіка-матэматычнага, хімічнага і біялагічнага факультэтаў. Іншагароднім студэнтам дадуць гарантаванае месца ў інтэрнаце на ўвесь тэрмін навучання ў ВНУ. Таксама першакурснікам будзе аказана матэрыяльная дапамога ў памеры 10 базавых велічынь.

З яго слоў, новаўвядзенні накіраваны на падтрымку студэнтаў, якія абралі няпростую, але сацыяльна значную прафесію педагога.

**Падрыхтавала Марыя КАРКВЕЛІС**

## РЭЙТЫНГ САМЫХ ВЫСОКІХ ПРАХАДНЫХ БАЛАЎ (ДЗЁННАЯ БЮДЖЭТНАЯ ФОРМА)

**Сацыяльна-эканамічныя і гуманітарныя спецыяльнасці**

| | | |
|---|---|---|
| «сусветная эканоміка» | 398 | ФМА |
| «міжнароднае права» | 398 | ФМА |
| «міжнародная эканоміка і гандаль (з паглыбленым вывучэннем кітайскай мовы)» | 397 | ЭКАНАМФАК |

**Прыродазнаўчыя спецыяльнасці**

| | | |
|---|---|---|
| «прыкладная інфарматыка» | 391 | ФПМІ |
| «інфарматыка» | 387 | ФПМІ |
| «кібербяспека» | 378 | ФПМІ |
| «прыкладная матэматыка» | 371 | ФПМІ |

## РЭЙТЫНГ САМЫХ ВЫСОКІХ ПРАХАДНЫХ БАЛАЎ (ДЗЁННАЯ ПЛАТНАЯ ФОРМА)

| | | |
|---|---|---|
| «міжнародная эканоміка і гандаль (з паглыбленым вывучэннем кітайскай мовы)» | 371 | ЭКАНАМФАК |
| «прыкладная інфарматыка» | 359 | ФПМІ |
| «інфарматыка» | 358 | ФПМІ |
| «прыкладная матэматыка» | 358 | ФПМІ |
| «міжнародныя адносіны» | 358 | ФМА |

## КОНКУРС (ЧАЛАВЕК НА МЕСЦА)

- 1,65 – НА ДЗЁННУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ
- 2,01 – НА ДЗЁННУЮ ПЛАТНУЮ ФОРМУ
- 3 – НА ЗАВОЧНУЮ БЮДЖЭТНУЮ ФОРМУ

## ДЗЁННАЯ БЮДЖЭТНАЯ ФОРМА Ў ЛІЧБАХ

- **95%** – 300+ балаў па выніках ЦТ і ЦЭ
- **44,6%** – выпускнікі ліцэяў і гімназій
- **16** – 400-бальных вынікаў ЦТ і ЦЭ
- **110** – пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд
- **992** – абітурыентаў з медалём і дыпломам з адзнакай
- **79** – абітурыентаў залічана без экзаменаў на педагагічныя спецыяльнасці

# НЕ ПРОСТА ВУЧОБА: ЯК ЛІЗАВЕТА ЗАНЬКО ПЕРАТВАРАЕ СТУДЭНЦТВА Ў ЯРКІ ВОПЫТ



**Яна не планавала ісці на журфак, але трапіла менавіта туды. Не ведала, як растлумачыць, што такое «інфармацыя і камунікацыя», а цяпер вывучае PR, рэкламу і маркетынг. Лізавета Занько – прадстаўніца банка даных адоранай моладзі Беларусі, студэнтка БДУ, кіраўніца праектнага напрамку студсавета і чалавек, які верыць, што «святло ёсць у кожнага – трэба толькі не баяцца зззяць».**

Гераіня вучыцца на спецыяльнасці «інфармацыя і камунікацыя» на факультэце журналістыкі. Як жартуе Лізавета, гэта тая спецыяльнасць, сэнс якой складана растлумачыць, асабліва дарослым ці людзям, якія пра яе нічога не ведаюць. Там студэнты вывучаюць сувязі з грамадскасцю, PR і рэкламу, а таксама маркетынг і менеджмент.

Лізавета Занько тлумачыць, што ў яе з самага пачатку была мэта – у любым выпадку паступіць у БДУ. Але на які факультэт? Гэта вырашыць было не так проста. Дзяўчына доўга выбірала паміж факультэтам міжнародных адносін, юрфакам і факультэтам журналістыкі. Спецыяльна на журфак яна не імкнулася. Лізавета мяркуе, што ёй, напэўна, проста пашанцавала, што ў год яе паступлення балы былі крыху ніжэйшыя. Так, на яе думку, ёй і ўдалося прайсці менавіта на факультэт журналістыкі. Увогуле, сутнасць выбару спецыяльнасці была ў тым, што абітурыентка шукала нешта без матэматыкі, фізікі ці хіміі. Больш гуманітарнае, магчыма, звязанае з мовамі і грамадазнаўствам прываблівала мацней. І спецыяльнасць інфакама стала ідэальнай для будучай студэнткі.

У Лізаветы быў момант, калі на этапе паступлення яна разумела, што не праходзіць на бюджэт на ФМА. Дзяўчына думала ісці на платнае навучанне, але потым вырашыла: толькі бюджэт.

Як прызнаецца Лізавета, яна дакладна не ведае, як трапіла ў банк даных адоранай моладзі Беларусі. Дзяўчына мяркуе, што гэта адбылося пасля таго, як прайшла падача дакументаў на прэзідэнцкую стыпендыю, якую дзяўчына атрымала. Гэта, безумоўна, звязана з выдатнай вучобай, навуковай дзейнасцю і актыўным удзелам у жыцці факультэта.

Студэнтка з'яўляецца кіраўніком праектнага напрамку студсавета журфака. Для яе гэта не проста арганізацыя, а людзі, якія робяць яе сапраўды асаблівай. Без студсавета Ліза не ўяўляе ні студэнцтва, ні свайго жыцця наогул. Яна кажа, што гэта прыярытэт, тое, чаму гатова аддаваць увесь вольны час. Кожны чалавек у камандзе неверагодны, і ў кожнага ёсць чаму павучыцца.

*– У маім студэнцтве шмат момантаў, да якіх я буду вяртацца ў думках яшчэ не адзін год. Але, напэўна, самы любімы і цёплы ўспамін – куратарства дня першакурсніка. Я дапамагала з творчым нумарам і арганізацыяй першаму курсу «інфакама». Тады мы атрымалі першае месца, і гэта быў самы яркі момант – не толькі з-за перамогі, а таму што я вельмі палюбіла першакурснікаў. Той час мы разам успамінаем з цеплынёй.*

Планаў на будучыню ў нашай гераіні шмат. Дзяўчына хоча развівацца ў сваёй сферы, магчыма, паспрабаваць сябе ў арганізацыі маштабных мерапрыемстваў, а пакуль яна займаецца SMM. План Лізаветы: пасля заканчэння ўніверсітэта стаць спецыялістам па інфармацыі і камунікацыі, і PR- ці івент-менеджарам.

Акрамя вучобы і кіраўніцтва студэнцкай арганізацыяй, Лізавета надае шмат часу хобі. Яшчэ да ўніверсітэта яна скончыла музычную школу, займалася танцамі – гэта былі яе асноўныя інтарэсы. Цяпер дзяўчына любіць гатаваць сняданкі, камунікуе з сябрамі, вучыцца новаму, чытаць і адкрываць для сябе цікавыя месцы ў Мінску.

*– У мяне досыць насычанае жыццё, з хуткім рытмам, таму я стала яшчэ мацней цаніць моманты, праведзеныя з сям'ёй. Акрамя таго, мне падабаецца весці асабістыя старонкі сацсетак – спадзяюся, што буду рабіць гэта яшчэ актыўней.*

Для такіх творчых спраў трэба пастаянна шукаць натхненне. Ліза бачыць яго ў першую чаргу ў сваіх бацьках. Асабліва ў тату, бо гэта, на думку чацвёртакурсніцы, самы разумны чалавек у яе атачэнні.

*– Мяне заўсёды натхняла яго імкненне да ведаў. А мама... Яе галоўная фраза: «Ты зробіш нешта для мяне, а я вярну табе гэта ўдвая». Яна сапраўды ўмее любіць – і навучыла гэтаму мяне.*

Сваім дэвізам па жыцці Лізавета лічыць выраз: «Крок за крокам – на нейкім этапе ты перастанеш баяцца». Яна растлумачыла, што заўсёды лічыла сябе даволі баязлівай, але, як выявілася, у яе характары ёсць і смеласць, і рашучасць. А апошнім часам натхненне і сілы рухацца наперад дае фраза, звязаная са студэнцтвам і праектным напрамкам: «У кожнага з нас ёсць святло – проста трэба яго раскрыць і не баяцца зззяць».

# АЛЯКСЕЙ ЗАЦАРЭНКА: «ВУЧУСЯ, ТАМУ ШТО ПАДАБАЕЦЦА, І ПАДАБАЕЦЦА, ТАМУ ШТО ВУЧУСЯ»

**Ад школьнага факультатыва па хіміі да міжнародных канферэнцый – шлях Аляксея Зацарэнкі даказвае: калі ёсць запал да навукі, магчымасці бязмежныя. Малады даследчык упэўнены, што хімія – гэта не толькі формулы, але і творчасць, настойлівасць і бясконцае імкненне да адкрыццяў.**

Аляксей вучыцца на спецыяльнасці «фундаментальная хімія». Выбраў факультэт ён даволі рана, у 9 класе. Школьніку падабалася хімія, і сваё жыццё ён вырашыў звязаць з навукай. Тады ж хлопец спыніўся на «фундаментальнай хіміі», бо гэта самая шырокая спецыяльнасць на факультэце. Студэнты-куратары яму сказалі, тут выкладчыкі распавядуць пра хімію ўсё, што самі ведаюць – гэта і прывабіла маладога чалавека.

Афіцыйна ў банк адоранай моладзі Аляксей трапіў ужо падчас навучання ў БДУ – за дасягненні, якія атрымаў яшчэ ў родным Віцебску ў школьныя гады. З хіміяй хлопца звязвала алімпіядная дзейнасць, з біялогіяй – навукова-даследчая работа.

*– Разам з навуковым кіраўніком Георгіем Арнольдавічам Шыбанавым з Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі з 8 па 11 клас мы правялі шмат даследаванняў у галіне гідрабіялогіі і экалогіі. Я трапіў у банк адоранай моладзі дзякуючы перамозе на XXXV Рэспубліканскім конкурсе біёлага-экалагічных работ у 11 класе.*

Цікавасць да хіміі ўзнікла ў Аляксея, як толькі прадмет сталі выкладаць у школе. Па запрашэнні настаўніка ён пачаў хадзіць на факультатывы, дзе школьнікам расказвалі больш, чым на звычайных уроках. Ужо ў 7 класе наш герой удзельнічаў у першай анлайн-алімпіядзе па хіміі.

У навукова-даследчай дзейнасці студэнта больш за ўсё прывабліваюць рэспубліканскія і міжнародныя форумы і канферэнцыі. Самае захапляльнае – гэта абарона перад аўдыторыяй і членамі журы. Самы доўгі досвед – каля 50 хвілін – быў у 2024 годзе на міжнароднай канферэнцыі «Сахараўскія чытанні» ў Санкт-Пецярбургу, дзе яго даследаванне было ўдастоена дыплома I ступені. За некалькі гадоў навуковай дзейнасці хлопец набыў досвед удзелу ў шматлікіх мерапрыемствах: штогадовая Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Юні-цэнтра» БДУ, Міжнародны водны конкурс даследчых праектаў (дзе яго працы атрымлівалі самыя высокія ўзнагароды), а таксама Рэспубліканскі конкурс навукова-тэхнічнай творчасці «ТэхнаІнтэлект». Прыемны досвед узаемадзеяння з замежнымі калегамі быў і на міжнародным конкурсе «Школьная прэм'ер-ліга» пад эгідай ЮНЕСКА.

У 10–11 класах малады чалавек праводзіў даследаванні на тэмы «Уплыў Віцебскай ГЭС на экалагічны стан ракі Заходняя Дзвіна» і «Уплыў Лукомскай ДРЭС на экалагічны стан вадаёма-ахаладжальніка». Працы нагадалі пра ўздзеянне чалавечага фактара на навакольнае асяроддзе і мелі значэнне як для беларускай навукі, так і для эканомікі і вытворчасці. Дзякуючы гэтаму малады навуковец паўдзельнічаў у «Вялікай размове» з прадстаўнікамі ўлады для абмеркавання плана развіцця зялёнай эканомікі ў Беларусі.

Сваю будучыню ён звязвае як з навукай, так і з выкладаннем. Раней ён не любіў гаварыць пра сваю цягу да педагагічнай дзейнасці, але прыкладам для яго сталі выкладчыкі факультэта. Большасць з іх самі скончылі гэтую спецыяльнасць і сталі сапраўднымі навукоўцамі.

На думку студэнта, хімік павінен мець шырокую базу матэматыкі і фізікі, бо гэта яго асноўны інструментарый. Разбірацца таксама ў біялогіі і геаграфіі. Марат лічыць, што да ўсяго можна падысці з пункту гледжання хіміі, а для сапраўднага навукоўца важны кругагляд і эрудыцыя. Усе адкрыцці робяцца на стыку навук, таму хіміку трэба ведаць шмат. Таксама важныя практычныя навыкі і ўменне творча падысці да эксперыменту, бо, калі хочаш чагосьці дасягнуць, ты павінен праявіць і настойлівасць, і фантазію. Без агеньчыку ў вачах і без упартага імкнення быць сапраўдным хімікам немагчыма – трэба смела ісці наперад.



У вольны ад вучобы час Аляксей любіць падарожнічаць па родных краях, наведваць замкі і музеі. Ён заўсёды адкрыты для мастацтва, з асаблівай любоўю ставіцца да тэатра і беларускай літаратуры. Зараз ён студэнт, даследчык, навуковец-пачатковец. Але хто ведае, можа, праз некалькі гадоў яго імя будзе асацыявацца з адкрыццямі ў хіміі або экалогіі.

Марыя КАРКВЕЛІС

УНІВЕРСІТЭТ
15 жніўня 2025 года, №8 (2299)

# СЕМ’І Ў БДУ: ГІСТОРЫІ КАХАННЯ

**Каханне не пра планаванне, а пра выпадковасць. Гісторыі знаёмства нашых герояў адрозніваюцца, аднак іх аб’ядноўвае адно – універсітэт, які стаў важным этапам у іх жыцці.**




## СЯМ’Я БАСКАКАВЫХ: КІРЫЛ І АЛЯЎЦІНА

*– Мы пазнаёміліся ў гімназіі ў Бабруйску. Вучыліся мы ў 11 і 10 класе, і, здавалася, з першых дзён паміж намі ўзнікла асаблівая сувязь. З тых часоў, як мы пачалі сустракацца, нашы жыцці перапляліся, і неўзабаве мы зрабілі наступны крок – пажаніліся 23 верасня 2023 года, адразу пасля заканчэння школы.*

Маладыя людзі разам вучацца ў БДУ: Кірыл на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а Аляўціна – на механіка-матэматычным факультэце. Дзякуючы таму, што абодва факультэты знаходзяцца ў галоўным корпусе БДУ, пара можа бачыцца падчас перапынкаў. Адукацыя для іх – гэта не толькі веды, але і магчымасць развіваць агульныя інтарэсы і мары.

Як адзначае Аляўціна, яны любяць праводзіць час, гатуючы розныя стравы. Настольныя гульні сталі не проста забавай, а спосабам умацавання адносін. Яны гуляюць, актыўна адпачываюць – катаюцца на байдарках, каньках, плаваюць, скачуць на батутах. Кожнае імгненне, праведзенае разам, напаўняе жыццё маладой сям’і радасцю і сэнсам.

Творчы патэнцыял гэтай пары таксама ўражвае. Аляўціна – рознабаковая асоба: яна малюе, стварае вырабы на святы і збірае канструктары. Акрамя таго, яна любіць пячы і гатуе пачастункі для мужа і сваякоў. Да паступлення дзяўчына займалася народнымі і сучаснымі танцамі на працягу многіх гадоў. Кірыл, у сваю чаргу, займаецца праграмаваннем, з’яўляецца пераможцам рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы і паўфіналу міжнароднай алімпіяды ICPC. Спорт таксама займае важнае месца ў яго жыцці, і ён імкнецца знаходзіць час для трэніровак.

*– Дакладнае ўсведамленне таго, што, незалежна ад выніку, нашы адносіны непарушныя, а пачуцці нязгасныя, надае нам упэўненасці ў пачынаннях. Мы ганарымся, што мы фарміруем наша жыццё разам, поплеч, бачым свае поспехі і працэс станаўлення нас як самастойных асоб.*

Мэты ў пары простыя, але важныя: быць апорай і падтрымкай адно для аднаго, сумесна развівацца і рэалізоўваць мары. Яны вераць, што толькі так можна стварыць моцную і шчаслівую сям’ю.

*– Мы з гонарам глядзім у будучыню, і ўпэўненыя, што наперадзе нас чакаюць толькі светлыя перспектывы і новыя здзяйсненні.*



## СЯМ’Я АРТАМОНАВЫХ: ДАР’Я І ПАВЕЛ

Гісторыя кожнай сям’і ўнікальная і непаўторная, але каханне – гэта тое, што звязвае іх усе. Гэтая ісціна з пакалення ў пакаленне перадаецца ў дынастыі Артамонавых. І яны вельмі цэняць гэтыя словы.

*– Усё пачалося з сумеснай працы ў газеце гістарычнага факультэта БДУ «Ніка». Мы шмат працавалі разам, абмяркоўвалі ідэі па паляпшэнні будучых нумароў газеты, развівалі сацыяльныя сеткі. Нам было цікава разам, і мы радаваліся поспехам газеты.*

На працягу года Дар’я была рэдактарам газеты, затым пасаду заняў Павел. Дар’я дапамагла яму асвоіцца, а ён дзяліўся ідэямі і планамі. Так пара паступова збліжалася. Газета паспрыяла таму, каб убачыць добрыя якасці ў партнёру, паказала, што маладыя людзі – сапраўдная каманда і могуць зрабіць адно аднаго лепшымі. Сям’я Артамонавых разам ужо больш за тры гады.

*– Мы шчаслівыя і цэнім кожнае імгненне. У кастрычніку 2024 года мы сталі мужам і жонкай. Той дзень назаўжды для нас напоўнены шчасцем, пяшчотай і цяплом. Мы шчаслівыя, што нашы родныя і сябры падзялілі з намі гэтае свята.*



## СЯМ’Я ВАРВАШЭВІЧАЎ: НАДЗЕЯ І МАКСІМ

«Каханне не ведае адлегласцяў, для яго не існуе кантынентаў, бо яго позірк заўсёды скіраваны да зорак». Вярнуўшыся назад у часе, ніхто б з гэтай пары не адказаў, што стаў бы «мужам» або «жонкай».

*– Мы пазнаёміліся спантанна. Паступіўшы на адзін факультэт, мы не заўважалі адно аднаго да моманту, які ў далейшым звёў нас і нашыя лёсы. Прычынай стаў звычайны навагодні дзіцячы ранішнік. Менавіта на дзіцячым свяце, убачыўшы, як кожны з нас праце на ўсе сто, каб унесці ў дзіцячае сэрца дробку шчасця, мы зразумелі, што менавіта з гэтым чалавекам, які цяпер танцуе ў касцюме Снягуркі або Дзеда Мароза, хочацца быць побач.*

У далейшым Надзея і Максім прыцягваліся быццам магнітам. Яны ўсюды шукалі сустрэчы, заўсёды спрабавалі знайсці момант для душэўных размоў сам-насам. Неўзабаве пара вырашыла стварыць сям’ю. Ідэя не была раптоўнай, прайшло тры гады. Адносіны паспелі прайсці праз агонь, ваду і медныя трубы. Жаданне быць з партнёрам, прачынацца побач з ім, атрымліваць ад яго падтрымку і хвалу было мацнейшым за любое выпрабаванне, якое сустракалася на жыццёвым шляху.

*– Для нас быць сям’ёй – гэта быць часткай чагосьці цёплага і вынятнага. Гэта месца, у якім ты заўсёды можаш схавацца ад праблем, якія накрываюць цябе з галавой. І мы ні на хвілінку не пашкадавалі, што прынялі рашэнне стаць сям’ёй.*

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

**Фізічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 13 верасня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 13 кастрычніка.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 15.08.2025 г.
Зак. 707. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*